УДК 371.3

Васілеўская В. А.

# ТАПАНІМІЧНЫЯ НАЗВЫ БЕЛАРУСІ

*Навуковы кіраўнік: ст. выкладчык Міцкевіч К. М.*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Тапаніміка – гэта навука, якая вывучае геаграфічныя аб’екты: уласныя назвы вёсак, хутароў, гарадоў, мястэчак, пасёлкаў, раз’ездаў, вуліц, праспектаў, дарог, азёр, рэчак, нізін, гор, балотаў, урочышчаў і г.д.

Таманіміка дзеліцца на некалькі частак:

– айконімы – назвы населеных пунктаў, гарадоў, вёсак, хутароў, пасёлкаў;

– урбонімы – назвы ўнутрыгарадскіх аб’ектаў: плошчаў, вуліц, паркаў, музеяў, тэатраў, помнікаў;

– гідронімы – назвы ўсялякіх водных аб’ектаў: рэчак, азёр, вадасховішчаў, балот;

– дрымонімы – назвы лясоў: бярэзнікаў, дубраў, хвойнікаў;

– касмонімы і астронімы – назвы касмічных аб’ектаў: сузор’яў, зорак, галактык [3].

Назвы некаторых беларускіх паселішчаў могуць вельмі зацікавіць. Напрыклад, каля Шклова знаходзяцца Старыя і Новыя Чамаданы. Недалёка ад іх ёсць Ягадкі.

Каб паехаць у Манголію, не трэба браць візу, дастаткова будзе проста наведаць вёску Манголію ў Віцебскай вобласці. Таксама ёсць у Беларусі і свой Парыж, які знаходзіцца ў Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці. І самае цікавае, у Беларусі можна знайсці вёску Беларусь.

Акрамя знакамітых краін і гарадоў, на Беларусі ёсць і касмічныя вёскі. Так, каля Дзяржынска знаходзяцца Марс і Юпітэр, а пад Лагойскам – прыгожая Венера.

Разгляд назваў беларускага этнасу і тэрыторый яго пражывання патрабуе адказаў на шматлікія пытанні і, у першую чаргу, аб генезісе самой назвы Белая Русь. Беларусь – гэта этнонім-мігрант. Як лічаць даследчыкі, спалучэнне Белая Русь упершыню ўжыў канцлер Польшчы Я. Чарыкоўскі ў XIV ст. Аднак гэта назва, як указвае даследчык В. Шур у сваёй кнізе “З гісторыі ўласных імёнаў”, бытавала яшчэ ў IX ст. Яе першымі сталі ўжываць волжскія булгары са значэннем “заходняя Русь”. У пісьмовых жа помніках, як адзначае В. Тацішчаў, тэрмін Белая Русь упершыню

засведчаны ў Раскольніцкім і Растоўскім рукапісах пад 1135 г. для абазначэння зямель Растова-Суздальскага княства. Аж да XVIII ст. гэтай назвай усходнія славяне і суседнія з імі народы называлі самыя разнастайныя ўсходнеславянскія землі.

У пазнейшы перыяд ва ўсходнеславянскіх народаў колерныя азначэнні пачалі выконваць іншую функцыю: белы сімвалізаваў станоўчыя адзнакі, вышэйшы нябесны пачатак, чорны абазначаў процілеглыя якасці і паняцці, і таму ў XIV ст. назва Белая Русь была замацавана за Маскоўскай Руссю, на долю якой выпала роля цэнтра. У XVI ст. тэрмін Белая Русь набыў значэнне "Вялікая Русь", а Іван III уключыў назву ў царскі тытул.

Падчас існавання беларускага этнасу адбылося шмат змяненняў у беларускай нацыянальнай тапаніміі. Вельмі шмат вёсак, гарадоў, паселішчаў было перайменавана. У новых назвах адлюстраваліся ў асноўным надзеі і спадзяванні на лепшае жыццё (Надзеждзіна, Новае Палессе, Уютны, Прагрэс, Мілавідная, Ударнае, Знаменка і інш.). Асобныя з такіх назваў характарызуюць, як правіла, са станоўчага боку новыя паселішчы (Светлагорск, Мірнае, Наваполацк, Новалукомль, Раздольнае, Салігорск, Навасёлкі і інш.), ушаноўваюць памяць вядомых дзеячаў краіны, сімвалізуюць юбілейныя даты (Леніна, Дзяржынск, Чапаева, Мархлеўск, Роза Люксембург, Першамайск, Акцябрскі, Перамога, Пабеднае і інш.). Тым не менш менавіта тады ўзнікла многа няўдалых назваў населеных пунктаў тыпу Адчаянны, Барба, Бязбожнік, Герой, Дзвігацель, Дзявятае Студзеня, Забіяка, Зара Новай Жызні, Зара Свабоды, Красная Плошчадзь, Луч Сонца, Непабядзімы, Пабядзіцель, Пуцяводная Звязда, Рассветная, Рашыцельны, Спутнік Міра, Труд, Уюты, Шлях Селяніна і інш. Нават такі невялікі пералік новых назваў дазваляе пераканацца, што новыя назвы ў пераважнай большасці з'яўляюцца надуманымі, няўдалымі, утворанымі з ігнараваннем законаў беларускай мовы і элементарнай логікі. І ўвогуле, тапанімічныя назвы Беларусі вельмі часта падвяргаліся розным зменам.

У кожнага тапоніма свой лёс. І кожны з іх адлюстроўвае такую характэрную асаблівасць аб'екта, якая была найбольш выразнай, важкай, самай адметнай яго рысай на момант узнікнення назвы. Цікава, а што ж лягло ў аснову назваў абласных цэнтраў Беларусі? Так, першапачаткам горада Менск (Мінск) было паселішча на рацэ Менка або Мень (ад назвы рыбы *мень*, якая вадзілася ў ёй). Затым ад назвы ракі і далі імя гораду – Менск (Меньск). Пазней, калі горад апынуўся ў складзе Рэчы Паспалітай, палякі назву пісалі на свой манер праз літару і – Мінск. Брэст, першапачаткова Бярэсце, паходзіць ад слова *бяроста*. У старажытных славян бяроста служыла асноўным матэрыялам для вырабаў, адсюль і назва горада. Паходжанне назвы горада Віцебск звязана з назвай ракі Віцьбы. Старажытная назва Витьбеск бярэ вытокі ад старaславянскага назоўніка

*вити* (*павіцце* – нізіна, топкая мясціна, балота). Назва Гомель паходзіць ад верхнялужыцкага слова *гоміла* ‘ўзгорак, насыпаны над пахаваным нябожчыкам, магіла’. У аснове назвы горада Гродна ляжыць слова *горад*, якое ўтворана ад славянскага *град*, што значыць ‘абгароджаная мясціна, у цэнтры якой пасяляліся людзі, будуючы замкі, крэпасныя вежы, памяшканні, каб жыць і займацца рамёствамі’. Назва горада Магілёў паходзіць ад слова *магіла*, але больш дакладна назву звязваюць з асабістым імем Магіла. У 1386г. існаваў замак, заснаваны кіеўскім князем Львом Данілавічам Могіем, г.зн. Магутным, Дужым, адсюль і пайшла назва замка Магілёў [1].

Самы старажытны тапонім, дакладна вядомы з летапісаў, – вёска Залессе. Назва ўпамінаецца ў “Даравальнай грамаце Вялікага князя полацкага Андрэя Альгердавіча…” за 1378 г. Тапонім Залессе – вельмі распаўсюджаная назва на Беларусі, якая тлумачыцца вельмі лёгка: месца за лесам.

Гэтак жа цікавая назва і маёй малой радзімы.

Капыль – месца ў Беларусі, на рацэ Мажы. Адміністрацыйны цэнтр Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Пра Капыль існуе такая легенда.

Даўно гэта было. На месцы Капыля стаяў замак багатага князя. Непадалёку ад замка цякла рэчка, якая разлівалася шырокім возерам каля княжых палацаў. У князя была адна дачка, ды такой прыгажосці, што князь надзвычай ганарыўся ёю і не дазваляў, каб на яе глядзелі простыя людзі.

Князёўна жыла ў святліцы, якая была ў высокай замкавай вежы. Адтуль яна магла глядзець праз акно на навакольны свет, любавацца хараством палёў, лесу, ракі. Звалі князёўну Паліна, або проста Поля. Аднойчы летам каля замка з’явіўся малады пастух, які вельмі хораша іграў на дудцы, якую ён сам і зрабіў. Князёўна пачула дзіўную песню дудара і вельмі зацікавілася музыкам і яго ігрою. Яна пераапранулася ў сялянскую вопратку, непрыкметна выйшла з вежы і прыбегла на бераг возера, дзе пастух пасвіў свой статак. Тут яна ўбачыла прыгожага юнака, які, угледзеўшы прыгажуню-дзяўчыну, не мог адвесці вачэй ад яе. Ён адразу пакахаў яе, як толькі ўбачыў, і зайграў так, што ўсё навокал было зачаравана тою ігрою. Коля (так звалі пастуха) дамовіўся з Поляй, што ноччу, як толькі ўзыдзе месяц, яны будуць катацца на чаўне па возеры.

Князь быў у паходзе, і яны так сустракаліся некаторы час. Вярнуўшыся з паходу, князь даведаўся аб сустрэчах закаханых. Князёўну замкнулі ў вежы. Бацькі яе меркавалі выдаць замуж за багатага чалавека. І вось у канцы лета ў цёмную рабінавую ноч, калі палыхала навальніца і бушавала возера, пастух падплыў на чаўне па возеры да самага замка і на жалейцы падаў голас сваёй каханай. Князёўне ўдалося выбрацца з вежы, і маладыя людзі кінуліся наўцёкі.

Стража падняла шум. Князь падняў на ногі ўсю чэлядзь, каб злавіць уцекачоў. Ён убачыў дачку і пастуха на чаўне сярод хваль, калі возера асвяціла бліскавіца. Мала-памалу навальніца прайшла, а як стала зусім светла, на возеры нікога ўжо не было. Тады ў роспачы бацька пракляў возера, якое ў той самы момант правалілася пад зямлю. Месца гэтае пасля таго сталі называць па імені закаханых: Колі і Полі – Ко-Поль, а пазней Капыль.

Але на думку географа Вадзіма Жучкевіча, аснова тапоніма Капыль ужывалася для абазначэння адной з прыладаў апрацоўкі зямлі накшталт матыкі або кіркі [2]. У беларускай мове слова «капыл» захавалася галоўным чынам для абазначэння верхняй часткі шавецкай калодкі, а часам аднаго з тыпаў малатка (балцкае *kople*). Захавалася і мянушка Капыл – ‘упарты, незгаворлівы чалавек’.

Акрамя таго, паводле папулярнага меркавання назва Капыль утварылася ад слова *капылле* – ‘поле, апрацаванае матыкай’. Аднак некаторыя даследчыкі мяркуюць, што назва паселішча ўтварылася ад слова *капальня* – частка паганскай бажніцы.

Геаграфічныя назвы – важны палітычны інструмент ва ўнутраным жыцці любой краіны, а таксама ў міжнародных зносінах. Калі б не было назваў, то мы нават не змаглі б сустракацца, гандляваць і ўвогуле перамяшчаццца.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Басик, С. Н. Топонимика Беларуси / С. Н. Басик. – Минск: БГУ, 2006. – 200 с.
2. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск: БГУ, 1974 – 448 с.
3. Рамановіч, М. А. Тапанімічныя назвы Беларусі [Электронны рэсурс] / М. А. Рамановіч. – Рэжым доступу: https://www.referat911.ru/Turizm/tamanimichnyya-nazvy-belarus/100857-1895187-place1.html. – Дата доступу: 06.04.2022.